**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па педагагічнай адукацыі

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________________ А.Г.Бахановіч
________________
Рэгістрацыйны №____________

**МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ**

**Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасці**
6-05-0112-02 Пачатковая адукацыя

**УЗГОДНЕНА**
Старшыня вучэбна-метадычнага
аб’яднання па педагагічнай адукацыі

_____________ А.І.Жук
________________________

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Галоўнага ўпраўлення
прафесійнай адукацыі Міністэрства
адукацыі Рэспублікі Беларусь
_____________ С.М.Пішчоў
___________________________

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Галоўнага ўпраўлення
агульнай сярэдняй, дашкольнай і
спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_____________ М.С.Кіндзірэнка
___________________________

**УЗГОДНЕНА**
Прарэктар па навукова-метадычнай
рабоце Дзяржаўнай установы
адукацыі “Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы”
_____________ І.У.Цітовіч
___________________________

Эксперт-нормакантралёр
________________ _______________

Мінск 2023

**СКЛАДАЛЬНІК:**
В.І. Свірыдзенка, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
Кафедра дашкольнай і пачатковай адукацыі педагагічнага факультэта ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М.Машэрава» (пратакол № 10 ад 24.05.2023);

А.В. Вернікоўская, дацэнт кафедры славянскіх моў установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ПРЫКЛАДНАЙ:**
Кафедрай беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (пратакол № 14 ад 15.06.2023);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (пратакол № 6 ад 21.06.2023);

Навукова-метадычным саветам па пачатковай і дашкольнай адукацыі вучэбна-метадычнага аб’яднання па педагагічнай адукацыі
(пратакол № 4 ад 22.06.2023)

Адказны за рэдакцыю: В.І. Свірыдзенка
Адказны за выпуск: В.І. Свірыдзенка

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Методыка выкладання беларускай мовы» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь ў адпаведнасці з патрабаваннямі агульнага адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0112-02 «Пачатковая адукацыя».

Актуальнасць вывучэння дысцыпліны вызначаецца тым, што моўнай адукацыі належыць важнае месца ў гуманітарным развіцці асобы, якое з'яўляецца прыярытэтнай задачай сучаснай школы. Навучанне беларускай мове ў Рэспубліцы Беларусь характарызуецца камунікатыўнай накіраванасцю, якая забяспечвае развіццё ў навучэнцаў гатоўнасці да эфектыўных маўленчых зносін у розных сферах дзейнасці. Менавіта таму пры падрыхтоўцы будучага настаўніка пачатковых класаў важна ўзброіць яго ведамі і ўменнямі, неабходнымі для фарміравання ў навучэнцаў базавых моўных ведаў, эмацыянальна-каштоўнасных адносін да беларускай мовы, маўленча-камунікатыўных і агульнавучэбных уменняў і навыкаў, пазнаваўчага інтарэсу, маральна-этычных якасцей, звязаных з захаваннем правіл і прынцыпаў зносін.

**Мэта вучэбнай дысцыпліны** – садзейнічаць набыццю студэнтамі тэарэтычных ведаў і практычных уменняў арганізацыі працэсу моўнай адукацыі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, кіравання пазнавальнай і камунікатыўнай дзейнасцю навучэнцаў на ўроках беларускай мовы.

**Задачы дысцыпліны:**

дапамагчы студэнтам засвоіць навукова-метадычныя веды аб накіраванасці, логіцы, структуры і змесце курса беларускай мовы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

сфарміраваць у студэнтаў прафесійна-метадычныя ўменні ў арганізацыі працэсу моўнай адукацыі: дапамагчы будучым настаўнікам усвядоміць мэту моўнай адукацыі; пазнаёміць з вучэбнымі праграмамі, вучэбнымі дапаможнікамі па беларускай мове; навучыць планаваць і арганізоўваць адукацыйны працэс, праводзіць розныя віды навучальных і кантрольных прац, весці апытанне; аб'ектыўна ацэньваць веды, уменні і навыкі навучэнцаў; правільна выкарыстоўваць нагляднасць і ТСН на ўроках беларускай мовы;

сфарміраваць прафесійныя ўменні настаўніка, здольнага забяспечыць навучэнцу паўнацэнную моўную адукацыю і маўленчае развіццё;

выхоўваць маральныя і прафесійна-значымыя якасці будучых педагогаў; стымуляваць творчыя пошукі студэнтаў, развіваць іх навукова-даследчыя здольнасці; удасканальваць навыкі самастойнай работы з навукова-метадычнай літаратурай.

Вучэбная дысцыпліна «Методыка выкладання беларускай мовы» звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Беларуская мова», «Методыка развіцця маўлення», «Методыка выкладання рускай мовы», «Методыка выкладання літаратурнага чытання», «Методыка навучання грамаце і каліграфія».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен
**ведаць:**
навукова-метадычныя асновы выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах;
змест і патрабаванні праграмы па беларускай мове для I ступені агульнай сярэдняй адукацыі;
асаблівасці пабудовы курса беларускай мовы ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання;
метады і прыёмы навучання мове;
асаблівасці прымянення электронных сродкаў у працэсе моўнай адукацыі;
методыку вывучэння кожнага з раздзелаў курса беларускай мовы ў пачатковых класах;
**умець**:
планаваць вучэбную работу на ўроках беларускай мовы ў пачатковых класах;
рэалізоўваць пазнавальныя, развіццёвыя і выхаваўчыя задачы на ўроках беларускай мовы;
праводзіць аналіз дыдактычнага моўнага матэрыялу і выкарыстоўваць яго ў розных відах вучэбнай дзейнасці;
спалучаць работу па засваенні вучнямі норм і законаў беларускай мовы з фарміраваннем лінгвакультуралагічных уяўленняў і ведаў, камунікатыўных уменняў і навыкаў, належных маўленчых паводзін;
прымяняць разнастайныя метады і прыёмы навучання мове;
выкарыстоўваць электронныя сродкі навучання ў працэсе моўнай адукацыі;
выяўляць, класіфікаваць і папярэджваць моўныя і маўленчыя памылкі рознага характару ў вусных выказваннях і пісьмовых працах навучэнцаў пачатковых класаў;
**валодаць**:
навыкамі падрыхтоўкі і правядзення ўрокаў беларускай мовы розных тыпаў;
метадамі і прыёмамі арганізацыі пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў;
інфармацыйна-камунікацыйнымі тэхналогіямі, якія забяспечваюць сучасны ўзровень моўнай адукацыі;
навыкамі ажыццяўлення кантрольна-ацэначнай дзейнасці ў працэсе навучання беларуска мове.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай мовы» накіравана на фарміраванне ў студэнтаў **універсальнай кампетэнцыі:** праяўляць ініцыятыву і адаптавацца да змен у прафесійнай дзейнасці; **базавых прафесійных кампетэнцый**: праектаваць працэс навучання, ставіць адукацыйныя мэты, адбіраць змест вучэбнага матэрыялу, метады і тэхналогіі на аснове сістэмы ведаў у галіне тэорыі і методыкі педагагічнай дзейнасці; ажыццяўляць адбор зместу, форм, метадаў і сродкаў навучання і выхавання, прымяняць іх у адукацыйным працэсе з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў.

У межах адукацыйнага працэсу па дадзенай вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны

патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны, выхаваць любоў і павагу да роднага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай мовы» адведзена ўсяго 108 гадзін, з іх 54 аўдыторныя. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 16 гадзін, практычныя – 32 гадзіны, лабараторныя – 6 гадзін.

Рэкамендаваная форма прамежкавай атэстацыі – экзамен.

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № | Назва раздзела, тэмы | Усяго аўдыторных гадзін | у тым ліку | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | лекцыі | практычныя | лабараторныя |
| 1 | **Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы** | **10** | **2** | **8** | **-** |
| 1.1 | Методыка выкладання беларускай мовы як навука | **4** | 2 | 2 | - |
| 1.2 | Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай мовы | **2** | - | 2 | - |
| 1.3 | Заканамернасці засваення мовы і прынцыпы навучання | **2** | | 2 | - |
| 1.4 | Метады і прыёмы навучання беларускай мове ў пачатковых класах | **2** | - | 2 | - |
| **2** | **Беларуская мова як вучэбны прадмет у пачатковых класах** | **12** | **2** | **8** | **2** |
| 2.1 | Мэты і змест пачатковай моўнай адукацыі | **4** | 2 | 2 | - |
| 2.2 | Асаблівасці пабудовы курса беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання | **2** | - | 2 | - |
| 2.3 | Урок беларускай мовы | **4** | - | 2 | 2 |
| 2.4 | Кантрольна-ацэначная дзейнасць на ўроках беларускай мовы | **2** | - | 2 | - |
| **3** | **Методыка вывучэння асобных тэм школьнага курса беларускай мовы ў пачатковых класа** | **32** | **12** | **16** | **4** |
| 3.1 | Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі | **6** | 2 | 2 | 2 |
| 3.2 | Методыка вывучэння элементаў лексікалогіі | **4** | 2 | 2 | - |
| 3.3 | Методыка вывучэння марфемнага складу слова і элементаў словаўтварэння | **4** | 2 | 2 | - |
| 3.4 | Методыка вывучэння марфалогіі | **8** | 2 | 4 | 2 |
| 3.5 | Методыка навучання арфаграфіі | **6** | 2 | 4 | - |
| 3.6 | Методыка вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах | **4** | 2 | 2 | - |
| | **Усяго:** | **54** | **16** | **32** | **6** |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## РАЗДЗЕЛ 1. АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

### 1.1. Методыка выкладання беларускай мовы як навука

Метадалагічныя асновы методыкі выкладання беларускай мовы: сувязь яе з філасофіяй, логікай, мовазнаўствам, псіхалогіяй, педагогікай; сучасныя тэарэтычныя падыходы (сістэмна-функцыянальны, камунікатыўна-дзейнасны, лінгвакультуралагічны, асобасна арыентаваны, кампетэнтнасны). Прадмет, задачы, структура курса методыкі выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах. Сістэма паняццяў і катэгорый лінгваметодыкі. Структура і метады лінгваметадычнага даследавання.

### 1.2. Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай мовы

Гістарычныя этапы развіцця методыкі выкладання беларускай мовы: перыяд станаўлення (1920–1930-я гг.), перыяд развіцця сістэмы моўнай адукацыі і лінгваметодыкі (1940–1980-я гг.), навейшы перыяд развіцця моўнай адукацыі і лінгваметодыкі ў Рэспубліцы Беларусь (канец XX ст. – пачатак XXI ст.). Роля К. М. Міцкевіча (Якуба Коласа) у станаўленні методыкі выкладання беларускай мовы. Актуальныя праблемы методыкі выкладання беларускай мовы на розных этапах. Найноўшыя навуковыя даследаванні ў галіне методыкі выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах.

### 1.3. Заканамернасці засваення мовы і прынцыпы навучання

Сутнасць паняцця «заканамернасць засваення мовы». Заканамернасці засваення беларускай мовы як першай (роднай). Адметныя заканамернасці засваення беларускай мовы як другой. Агульнадыдактычныя прынцыпы навучання беларускай мове: навуковасці, сістэматычнасці і паслядоўнасці, свядомасці і актыўнасці, адзінства навучання, выхавання і развіцця, станоўчага эмацыянальнага фону, антрапалізацыі адукацыі і інш. Сутнасць паняцця «лінгвадыдактычны прынцып навучання». Лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання беларускай мове: функцыянальна-камунікатыўнай накіраванасці навучання, уліку фактару бікультурнага развіцця дзіцяці, скіраванасці навучання на этнакультурнае асэнсаванне беларускай мовы, арыентацыі працэсу навучання на засваенне літаратурных норм, дыферэнцыяльна-сістэматычны прынцып засваення беларускай мовы як другой і інш.

### 1.4. Метады і прыёмы навучання беларускай мове ў пачатковых класах

Класіфікацыі метадаў навучання: паводле крыніцы перадачы і ўспрымання вучэбнай інфармацыі (славесныя, наглядныя, практычныя, сінтэтычнага характару і інш.), паводле логікі перадачы інфармацыі (індуктыўныя, дэдуктыўныя і інш.), паводле характару вучэбнай дзейнасці (рэпрадуктыўныя і праблемна-пошукавыя). Асноўныя метады навучання беларускай мове: моўны аналіз, моўны сінтэз (канструяванне), паведамленне настаўніка, гутарка, дыдактычная гульня, метад практыкаванняў, камунікатыўныя метады. Прыёмы навучання беларускай мове: супрацьпастаўленне, падстаноўка, замена, трансфармацыя, групоўка, алгарытмізацыя і інш.

# РАЗДЗЕЛ 2. БЕЛАРУСКАЯ МОВА ЯК ВУЧЭБНЫ ПРАДМЕТ У ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

## 2.1. Мэты і змест пачатковай моўнай адукацыі

Значэнне беларускай мовы ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі, у фарміраванні інтэлектуальна развітай асобы. Месца беларускай мовы ў тыпавых вучэбных планах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Стратэгічная мэта моўнай адукацыі. Мэта і задачы навучання беларускай мове на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Крытэрыі, педагагічныя і лінгваметадычныя прынцыпы адбору зместу пачатковай моўнай адукацыі. Пераемнасць і перспектыўнасць у выкладанні беларускай мовы.

Адукацыйны стандарт пачатковай адукацыі як аснова распрацоўкі вучэбна-праграмнай дакументацыі, арганізацыі працэсу моўнай адукацыі і ажыццяўлення кантролю яе якасці. Праграмы па беларускай мове для І ступені агульнай сярэдняй адукацыі: прынцыпы пабудовы, раздзелы, змест, патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў па гадах навучання. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне працэсу моўнай адукацыі ў пачатковых класах.

## 2.2. Асаблівасці пабудовы курса беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання

Спецыфіка пабудовы праграм па беларускай мове для ўстаноў адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання. Задачы вуснага курса, інтэграваны характар уступнага курса, маўленча-камунікатыўная і навучальна-моўная дзейнасць навучэнцаў пры вывучэнні раздзелаў «Гукі і літары», «Слова», «Сказ», «Тэкст». Стратэгіі авалодання другой мовай (імітацыя, звышгенералізацыя, перанос, аўтаматызацыя новых ведаў у практычнай дзейнасці з акцэнтаваннем увагі на іх функцыянальнай значымасці і інш.) і камунікатыўныя стратэгіі (семантычнае і моўнае спрашчэнне, апора на вядомае, карэкціраванне выказвання і інш.), якія засвойваюцца навучэнцамі пачатковых класаў. Арганізацыя працы па папярэджанні інтэрферэнцыйных памылак.

## 2.3. Урок беларускай мовы

Індывідуальныя, групавыя, франтальныя, парныя, класныя і пазакласныя, школьныя і пазашкольныя формы навучання беларускай мове.

Урокі беларускай мовы, іх тыпы і структурныя кампаненты, асаблівасці пабудовы ў залежнасці ад зместу, тэмы, этапаў навучання, падрыхтоўкі вучняў. Патрабаванні да ўрокаў беларускай мовы.

Наглядныя дапаможнікі, тэхнічныя і электронныя сродкі навучання, іх месца на ўроках беларускай мовы і прыёмы выкарыстання.

Арганізацыя паўтарэння на ўроках беларускай мовы. Сістэматычнасць паўтарэння з мэтай замацавання вывучанага і паглыблення ведаў вучняў. Спецыяльныя ўрокі падагульнення вывучанага матэрыялу, іх структура, змест, асаблівасці арганізацыі.

## 2.4. Кантрольна-ацэначная дзейнасць на ўроках беларускай мовы

Віды кантролю: па месцы ў працэсе навучання (папярэдні, паўрочны, тэматычны), па змесце (прагнастычны, пааперацыйны, кантроль па выніку),

па суб'ектах кантрольна-ацэначнай дзейнасці (знешні кантроль аднакласнікамі (узаемакантроль і ўзаемаацэнка) або педагогам, рэфлексіўны (самакантроль і самаацэнка)). Дыягностыка моўнага і маўленчага развіцця навучэнцаў як прадмет кантрольна-ацэначнай дзейнасці на ўроках беларускай мовы. Формы кантролю на ўроках беларускай мовы: вусны (франтальнае, групавое, парнае, індывідуальнае апытанне), пісьмовы (самастойная работа, тэст, кантрольны дыктант, кантрольная работа).

Адукацыйная, стымулюючая, кантрольная і выхаваўчая функцыі ацэнкі на ўроках беларускай мовы. Ацэнка славесная і бальная. Асаблівасці арганізацыі безадзнакавага навучання на ўроках беларускай мовы ў 1-2 класах. Дзесяцібальная сістэма ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў на ўроках беларускай мовы ў 3-4 класах.

Нормы ацэнкі вуснага адказу, навучальных пісьмовых работ (класных і дамашніх), кантрольных пісьмовых работ (кантрольнае спісванне, кантрольны дыктант, кантрольны дыктант з граматычным заданнем, кантрольны слоўнікавы дыктант, кантрольная работа па тэме, тэматычны рознаўзроўневы тэст).

## РАЗДЗЕЛ 3. МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ АСОБНЫХ ТЭМ ШКОЛЬНАГА КУРСА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

### 3.1. Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі

Адукацыйнае і практычнае значэнне вывучэння фанетыкі і графікі. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння фанетыкі і графікі (апора на фанематычны слых вучняў, разгляд гука ў марфеме, супастаўленне гукаў і літар). Задачы і змест вывучэння раздзела «Гукі і літары» ў 2 класе. Метады і прыёмы вывучэння фанетыкі і графікі. Методыка працы над гукамі, літарамі, складам, націскам. Развіццё ў навучэнцаў уменняў вызначаць гукавы і літарны склад слоў, распазнаваць галосныя і зычныя гукі, націскныя і ненаціскныя склады, парныя па цвёрдасці і мяккасці, звонкасці і глухасці зычныя гукі. Фарміраванне ў вучняў пачатковых класаў гукавога і графічнага вобразаў слоў, іх суаднясенне, высвятленне агульнага і адметнага. Знаёмства з алфавітам, фарміраванне ўменне карыстацца ім на практыцы.

Развіццё мыслення і маўлення дзяцей пры вывучэнні асноў фанетыкі і графікі. Развіццё ў вучняў фанематычных уменняў, выпрацоўка навыкаў літаратурнага вымаўлення. Арфаэпічныя і акцэнталагічныя памылкі, прычыны іх узнікнення, прыёмы і спосабы папярэджання і выпраўлення.

### 3.2. Методыка вывучэння элементаў лексікалогіі

Значэнне вывучэння элементаў лексікалогіі ў пачатковых класах. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння элементаў лексікалогіі (сістэмны, кантэкстны, лексіка-граматычны, функцыянальна-семантычны, тэматычны). Задачы і змест вывучэння тэмы «Значэнне слова» ў пачатковых класах. Метады і прыёмы вывучэння элементаў лексікалогіі. Методыка знаёмства з адназначнымі і мнагазначнымі словамі, з прамым і пераносным значэннем слова, з сінонімамі, антонімамі. Выпрацоўка ўменняў карыстання тлумачальным слоўнікам. Папярэджанне інтэрферэнцыйных памылак вучняў

пры знаёмстве з міжмоўнымі амонімамі. Умовы паспяховага засваення лексічнага матэрыялу і фарміравання лексічных навыкаў.

Узбагачэнне і актывізацыя слоўнікавага запасу, развіццё лагічнага мыслення навучэнцаў пры вывучэнні элементаў лексікалогіі.

**3.3. Методыка вывучэння марфемнага складу слова і элементаў словаўтварэння**

Значэнне вывучэння марфемнага складу слова ў пачатковых класах. Значэнне словаўтваральнай працы ва ўзбагачэнні слоўнікавага запасу навучэнцаў. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфемнага складу слова (структурна-словаўтваральны, лексіка-словаўтваральны, матывацыйны). Задачы і змест вывучэння тэмы «Склад слова» ў пачатковых класах.

Сістэма вывучэння марфемнага складу слова ў пачатковых класах: знаёмства вучняў з асаблівасцямі аднакаранёвых слоў і кораня слова, з роляй прыставак, суфіксаў, канчатка; вызначэнне асновы слова; паглыбленне ведаў пра марфемны склад слова і элементы словаўтварэння ў сувязі з вывучэннем часцін мовы.

Метады і прыёмы вывучэння марфемнага складу слова. Марфемны разбор як сродак асэнсаванага ўсведамлення марфемнай структуры слова.

Выпрацоўка арфаграфічнага навыку на аснове засваення марфемнай будовы слова. Віды практыкаванняў для вывучэння марфемнай будовы слова і выпрацоўкі арфаграфічных навыкаў.

**3.4. Методыка вывучэння марфалогіі**

Значэнне вывучэння марфалогіі ў пачатковых класах. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфалогіі (лексіка-граматычны, парадыгматычны, марфолага-сінтаксічны).

Задачы і змест працы па вывучэнні часцін мовы ў пачатковых класах.

Сістэма вывучэння назоўніка ў пачатковых класах. Методыка азнаямлення вучняў з родам, лікам, склонам назоўнікаў. Знаёмства са скланеннем назоўнікаў. Засваенне склонавых пытанняў. Ужыванне прыназоўнікаў з назоўнікамі розных склонаў. Практычнае авалоданне формамі назоўнікаў першага, другога, трэцяга скланення. Развіццё маўлення і мыслення навучэнцаў пры вывучэнні назоўнікаў.

Сістэма вывучэння прыметніка ў 2–4 класах: фарміраванне паняцця «прыметнік», праца над катэгорыямі роду, ліку і склону прыметніка. Лексіка-стылістычная работа ў працэсе вывучэння прыметніка.

Сістэма вывучэння дзеяслова ў 2–4 класах: фарміраванне паняцця «дзеяслоў», азнаямленне вучняў з формамі часу дзеяслова, са змяненнем дзеясловаў па асобах і ліках; паняцце пра неазначальную форму дзеяслова, пра першае і другое спражэнні дзеясловаў. Развіццё маўлення вучняў у працэсе вывучэння дзеяслова.

Асаблівасці вывучэння займенніка ў пачатковых класах: практычнае выкарыстанне прыналежных і пытальных займеннікаў; знаёмства з асабовымі займеннікамі, асаблівасцямі іх змянення і ўжывання. Фарміраванне культуры маўлення навучэнцаў пры знаёмстве з асабовымі займеннікамі.

Методыка працы над прыназоўнікамі і злучнікамі ў пачатковых класах. Работа над усведамленнем вучнямі ролі прыназоўнікаў, іх семантыкі. Навучанне выкарыстанню ў маўленні граматычных канструкцый з прыназоўнікамі і злучнікамі.

Метады і прыёмы вывучэння марфалогіі. Выпрацоўка арфаграфічнага навыку пры вывучэнні часцін мовы.

**3.5. Методыка навучання арфаграфіі**

Задачы, змест, прынцыпы навучання арфаграфіі. Сутнасць арфаграфічнага навыку, умовы яго выпрацоўкі. Сутнасць і структура арфаграфічнага дзеяння. Выпрацоўка ўмення вызначаць арфаграфічную задачу. Паслядоўнасць вырашэння арфаграфічнай задачы.

Методыка працы над арфаграфічным правілам. Фарміраванне ў вучняў умення прымяняць арфаграфічныя правілы на пісьме, улічваць тэарэтычныя звесткі, атрыманыя пры вывучэнні фанетыкі, марфемнай будовы слова, граматыкі.

Прыёмы выпрацоўкі правапісных уменняў і навыкаў з улікам прынцыпаў сучаснай беларускай арфаграфіі, характару напісанняў, этапаў навучання. Роля зрокавых, слыхавых, кінестэзічных аналізатараў у фарміраванні арфаграфічных дзеянняў. Алгарытмізацыя ў навучанні арфаграфіі. Прыёмы і формы развіцця арфаграфічнай пільнасці.

Арфаграфічныя практыкаванні (розныя віды спісвання і дыктантаў, граматыка-арфаграфічны разбор, лексіка-арфаграфічныя практыкаванні), методыка іх правядзення. Праца з арфаграфічным слоўнікам.

Методыка вывучэння слоў з цяжкімі арфаграмамі (слоўнікавых слоў).

Тыпалогія і прычыны арфаграфічных памылак. Папярэджанне арфаграфічных памылак у пісьмовых працах навучэнцаў пачатковых класаў. Арганізацыя працы над арфаграфічнымі памылкамі.

**3.6. Методыка вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах**

Значэнне вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі (інтанацыйны, марфолага-сінтаксічны, сэнсавы, прынцып навучання пунктуацыі ва ўзаемасувязі з сінтаксісам). Задачы і змест вывучэння раздзела «Сказ» у пачатковых класах. Лінейна-канцэнтрычны прынцып падачы сінтаксічнага і пунктуацыйнага матэрыялу ў 2–4 класах. Методыка фарміравання ў вучняў асноўных сінтаксічных паняццяў (сказ, тыпы сказаў, будова сказа, сувязь слоў у сказе, галоўныя і даданыя члены сказа, аднародныя члены сказа). Методыка працы над пунктаграмамі. Умовы эфектыўнага засваення сінтаксічных і пунктуацыйных паняццяў. Метады і прыёмы вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі. Сінтаксічны разбор як сродак асэнсаванага ўсведамлення структуры сказа. Месца камунікатыўных практыкаванняў у сістэме выпрацоўкі сінтаксічных і пунктуацыйных уменняў і навыкаў навучэнцаў.

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## АСНОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Антановіч, Н. М. Навучанне арфаграфіі ў пачатковых класах: вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Н. М. Антановіч. – Мінск : Нар. асвета, 2021. – 204 с.

2. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.

3. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс па вучэб. дысцыпліне для спецыяльнасці 1-01 02 01 «Пачатковая адукацыя» / склад. В. І. Свірыдзенка, Н. М. Антановіч // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: https://elib.bspu.by/handle/doc/2236. – Дата доступу: 30.11.2021.

4. Сянкевіч, М. І. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання : курс лекцый / М. І. Сянкевіч. – Брэст : БрДУ, 2020. – 224 с.

## ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Образовательный стандарт начального образования // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. – 2019. – № 2. – С. 3–15.

2. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : план-канспект урокаў : 2 кл. / В. І.Свірыдзенка, Н. У. Антонава. - Мінск: Аверсэв, 2017. – 269 с.

3. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова ў 3 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2018. – 239 с.

4. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова ў 4 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – 224 с.

5. Свірыдзенка, В. І. Фарміраванне маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў: тэорыя і практыка / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2019. – 280 с.

## РЭКАМЕНДАВАНЫЯ ФОРМЫ І МЕТАДЫ НАВУЧАННЯ

Асноўнымі метадамі навучання, якія спрыяюць уключэнню студэнтаў у пошук і творчую перапрацоўку ведаў, набыццё вопыту самастойнага рашэння разнастайных задач, з'яўляюцца: метады праблемнага навучання (рашэнне праблемных задач, аналіз педагагічных сітуацый, аналіз відэафрагментаў урокаў), інтэрактыўныя метады (распрацоўка план-канспектаў урокаў, правядзенне фрагментаў урокаў, выкананне практыкаарыентаваных заданняў), камунікатўныя метады (дыскусіі, вучэбныя дэбаты і іншыя інтэрактыўныя формы і метады), праектныя метады (курсавое праектаванне).

Пералічаныя метады патрабуюць шырокага выкарыстання групавых, парных і індывідуальных форм навучаня.

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для дыягностыкі кампетэнцый, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць:

– тэсты і тэставыя заданні (у тым ліку ў сістэме Moodle);

– комплексныя кантрольныя работы с рознаўзроўневымі і практыкаарыентаванымі заданнямі;

– экзамен.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Самастойная работа з'яўляецца спецыфічным педагагічным сродкам арганізацыі і кіравання самастойнай дзейнасцю студэнтаў у вучэбным працэсе. Самастойная работа студэнтаў (СРС) фарміруе гатоўнасць да самаадукацыі, павышэння кваліфікацыі, рыхтуе базу для непарыўнай адукацыі.

Пры вывучэнні дысцыпліны рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя формы самастойнай работы студэнтаў:

– падбор і аналіз навукова-метадычнай літаратуры па тэме заняткаў;

– аналіз праграм, падручнікаў і метадычных дапаможнікаў;

– распрацоўку і складанне схем, табліц, сродкаў нагляднасці;

– распрацоўку планаў-канспектаў урокаў, фрагментаў урокаў;

– падбор дыдактычнага матэрыялу па прапанаваных тэмах.